

# Урок 88

Разгледзь вылічэнні. Дапоўні разважанне.

$$34 \cdot 20 = 34 \cdot (2 \cdot 10) = (34 \cdot 2) \cdot 10 = 68 \cdot 10 = 680$$



1. Трэба 34 памножыць на ... .
2. Прадстаўляю 20 у выглядзе здабытку лікаў … і … .
3. Спачатку множу 34 на 2, атрымліваю ... .
4. Потым 68 множу на ..., атрымліваю 680.

Разгледзь розныя запісы вылічэнняў. Растлумач.

$$321 \cdot 200 = 321 \cdot (2 \cdot 100) = (321 \cdot 2) \cdot 100 = 64\,200$$




**1.** Вылічы.
$17 \cdot 30$ $\quad 41 \cdot 20$ $\quad 30 \cdot 21$ $\quad 40 \cdot 13$

**2.** Вылічы ў слупок.
$235 \cdot 40$ $\quad 217 \cdot 300$ $\quad 153 \cdot 3000$
$50 \cdot 257$ $\quad 400 \cdot 547$ $\quad 2000 \cdot 424$

**3.** Рашы ўраўненні. Выканай праверку з дапамогай калькулятара.
$x + 22\,222 = 101\,503$ $\quad 5 \cdot a = 8315$
$38\,718 - y = 19\,088$ $\quad 1216 : b = 8$

**4.** Параўнай.
7 г ? 700 мін $\quad$ 270 с ? 4 мін 7 с
300 мін ? 5 г $\quad$ 3 г 15 мін ? 195 мін

**5.** З 39 м тканіны можна пашыць 9 аднолькавых касцюмаў. Колькі метраў тканіны спатрэбіцца для пашыву трох такіх касцюмаў?


Правообладатель Национальный институт образования





**6.** Акружнасць Зямлі роўная 40 000 км (па экватары), што прыблізна складае $\frac{1}{10}$ частку адлегласці ад Зямлі да Месяца. Знайдзі адлегласць ад Зямлі да Месяца.

**7.** Складзі і рашы задачу.

| Скорасць, км/г | Час, г | Адлегласць, км |
|---|---|---|
| аднолькавая | 3 | ? } 180 |
| | 7 | ? |

**8.** На 100 км шляху аўтамабіль расходуе 10 л бензіну. У бензабаку аўтамабіля ёсць 30 л бензіну. Да якіх абласных цэнтраў можа даехаць гэты аўтамабіль з Мінска без запраўкі? Адлегласці ад Мінска да абласных цэнтраў паказаны ў табліцы.

| | Брэст | Віцебск | Гомель | Гродна | Магілёў |
|---|---|---|---|---|---|
| Мінск | 350 км | 290 км | 320 км | 280 км | 200 км |

Дапоўні другі сказ.
«Трэба памножыць лік 57 на 30. Спачатку множу 57 на ..., а потым атрыманы вынік множу на ...».

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
$129 \cdot 60$ $247 \cdot 400$ $127 \cdot 3000$

**2.** Купілі 10 аднолькавых пакетаў з разынкамі. На выпечку булачак пайшло 1400 г купленых разынак, а на прыгатаванне кекса — 600 г. Колькі пакетаў з разынкамі зрасходавалі для выпечкі булачак? Кекса?



Правообладатель Национальный институт образования